УДК 378.017:17

Н. Я. Савіцкая, ст. выкладчык (БДТУ)

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ

У артыкуле разглядаюцца такія паняцці, як глабалізацыя, мараль, маральнасць, духоўнасць, аналізуюцца прычыны крызісу духоўнай культуры ў сучасным свеце, магчымасць маніпуляваць свядомасцю мільёнаў людзей з дапамогай Інтэрнэта і СМІ. Звяртаецца ўвага на неабходнасць выпрацоўкі і захавання каштоўнасна-светапогляднай бяспекі, якая забяспечваецца маральна-духоўным выхаваннем асобы і з'яўляецца звышзадачай усяго працэсу адукацыі і выхавання моладзі.

The article concerns such notions, as globalization, morality, moral, spirituality. The reasons of spirituality culture crisis in modern society and the possibility of manipulating with awareness of million people through the Internet and mass media are analyzed. The author highlights the necessity of the development and maintenance of world outlook value safely which is ensured by moral and spiritual education of a person, being the top task and learning, education work with the youth.

**Уводзіны.** У цяперашні час мы з'яўляемся не толькі сведкамі, але і непасрэднымі ўдзельнікамі найважнейшых працэсаў у жыцці беларускага грамадства і дзяржавы. На нашых вачах адбываецца ўмацаванне і развіццё нацыянальнай свядомасці, аднаўленне гістарычнай памяці і зварот да духоўнай спадчыны нашага народа. Усё гэта непасрэдна звязана з далучэннем грамадзян, і ў першую чаргу моладзі, да шматвяковай традыцыі хрысціянства, бо на працягу стагоддзяў менавіта хрысціянства вызначала асновы нацыянальнай самасвядомасці, узбагачала скарбніцу беларускай нацыянальнай культуры, захоўваючы для нашчадкаў лепшыя творы архітэктуры, літаратуры і царкоўнага мастацтва, сцвярджаючы маральныя ўстоі, ствараючы асвету, укараняючы дабрадзейнасць.

Але ў працэсе ўмацавання беларускай дзяржаўнасці востра стаіць пытанне аб духоўна-маральнам выхаванні моладзі. Чалавек у сучасным свеце постмадэрнізму знаходзіцца ў пошуках духоўных асноў, здольных вярнуць страчаную веру ў дасягненне гармоніі, стабільнасці і згоды.

**Асноўная частка.** Беларусь – цэнтр Еўропы, таму яе не могуць абмінуць як агульнаеўрапейскія працэсы, так і сусветныя працэсы глабалізацыі.

І як у гэтых складаных працэсах будаваць дзяржаву, ствараць новую эканоміку, палітыку, што прыняць з новага, што змяніць у старым ладзе жыцця, ад чаго пазбавіцца, што ўмацаваць? Як стаць рэальна самастойнай незалежнай дзяржавай у эканамічным, палітычным, экалагічным, культурна-маральным плане?

Адказваючы на гэтыя пытанні, варта пачаць з крызісных з'яў у духоўнасці вялікай часткі грамадства.

Эканаміст В. Нікалаеўскі адзначае, што чалавецтва з прычыны паступовай духоўнай дэградацыі падыходзіць да небяспечнай рысы, за якой створаны ім магутны інтэлектуальны і тэхналагічны патэнцыял, які можа пагражаць выжыванню Чалавека як віда і цывілізацыі ў цэлым. Гэта фактычна азначае, што свет пераступіў парог новай ступені развіцця чалавечай цывілізацыі – постіндустрыялізму, аднак ён мае даволі смутнае ўяўленне аб шляхах рашэння спадарожных праблем.

Змены, якія адбываюцца ў сучасным свеце, – ёсць вынік дзеяння асноўнага закона сацыяльна-эканамічнага развіцця чалавечай цывілізацыі – закона глабалізацыі [1].

Тэрмін «глабалізацыя» звязаны з імем амерыканскага сацыёлага Р. Робертсана, які ўпершыню выкарыстаў яго ў 1983 г. Сінтэз тэорыі глабалізацыі і постіндустрыялізму (інфармацыйнага грамадства) прасочваецца ў працы М. Кастэльса [2], дзе даказваецца ўплыў інфармацыйных тэхналогій на змяненне палітыкі, эканомікі, культуры грамадства. Сёння глабалізацыя стала аб'ектыўнай рэальнасцю, у якой мы жывём кожны дзень і якая праяўляецца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці.

Постіндустрыяльны этап глабалізацыі грамадства з прычыны яго тэхналагічных магчымасцей істотна павышае ступень уплыву індывіда на глабальную сацыяльна-экалагічную сістэму і аб'ектыўна патрабуе асаблівай увагі да яго духоўных якасцей. А глабальны фінансавы крызіс указвае на няздольнасць сусветнай супольнасці супрацьстаяць разбурэнню сістэмы традыцыйных духоўнах каштоўнасцей чалавека. Чалавецтва дасягнула высокіх тэхналагічных поспехаў, але яшчэ не мае вопыту і ведаў пабудовы новай інстытуцыянальнай мадэлі дзяржавы, якая адпавядала б постіндустрыяльнаму этапу глабалізацыі. Многія навукоўцы канстатуюць, што страчана духоўнасць цывілізацыі, а аднаўленне яе – надзвычай складаная задача.

Вядома, што з капіталам як вынікам дзейнасці чалавека перыядычна ўзнікаюць праблемы ў тых, хто схільны да непамернага ўзбагачэння за кошт іншых, улады і г. д., пераступаючы маральныя нормы, страчваючы духоўнасць.

Але тут якраз варта нагадаць пра духоўную сілу Чалавека і прывесці выказванне Мітрапаліта Філарэта: «Чалавек перажывае той свет, у якім ён жыве. Чалавек не толькі грахоўны: ён закліканы да пераадолення сваёй грахоўнасці і да духоўнага ўзрастання… Толькі ў гэтым імкненні і на гэтым шляху чалавек можа пераадолець грахоўныя жарсці, якія ўстаюць на гэтым шляху. Не проста барацьба са злом у сабе і ў свеце, але і тварэнне дабра і яго сцвярджэнне, устанаўленне – вось духоўная задача чалавека» [3].

І сапраўды толькі духоўна моцны Чалавек можа супрацьстаяць матэрыяльным спакусам і хуткаму ўзбагачэнню за кошт прыгнечання і абкрадвання іншага чалавека, фарміруючы вакол сябе атмасферу даверу, добразычлівасці, узаемадапамогі, удзелу ў лёсе бліжняга.

А як сёння вызначаецца паняцце «духоўнасць»? Напрыклад, у «Философском энциклопедическом словаре» (М.: Сов. энциклоп., 1983) такое паняцце ўвогуле адсутнічала. А сёння, у сувязі з глабалізацыяй, яно надзвычай актуальнае.

Вядомы багаслоў А. І. Осіпаў выдзяляе два вызначэнні духоўнасці – свецкае і рэлігійнае. Свецкая духоўнасць уключае ў сябе элементы культуры (культурнасці), маральнасць, эрудзіраванасць, эстэтыку, этыкет. Рэлігійная духоўнасць звязана з імкненнем да святасці, да вызвалення ад жарсцяў, ад духоўнай поскудзі, дрэнных учынкаў і звычак, звязана з любоўю да Бога і бліжняга. У той жа час праблема вызначэння духоўнасці з'яўляецца асноўнай не толькі для рэлігіі, але і для кожнага чалавека, паколькі менавіта станам духу абумоўлен ў канчатковым выніку характар, накірунак і сама разумнасць усёй чалавечай дзейнасці. Свецкая духоўнасць прыроўніваецца, хутчэй, да культуры ў яе духоўным аспекце [4].

У нашай свядомасці паняцце «духоўнасць» звязана з паняццем «вера». На пытанні, хто такая «духоўная асоба» і што такое «духоўнасць», просты чалавек адкажа, што гэта святар, а духоўнасць – вера. І ў гэтым ёсць логіка. Вядома, першай формай адлюстравання духоўнага свету чалавека з'яўляецца міф. У ім спалучаюцца пачаткі ведаў, веравання, палітычных поглядаў, філасофіі, розных відаў мастацтва. Але вера займае вядучае месца. Яна нараджаецца ўнутры чалавека, фарміруе маральныя арыенціры, паводзіны людзей у рэальным жыцці. Аднак акрамя Веры, паняцце «духоўнасць» спалучае ў сабе Дабро, Ісціну і Прыгажосць. Менавіта так успрымалі духоўнасць і грэкі, і славяне, такога традыцыйнага погляду прытрымліваемся сёння і мы. Культура ў сваёй аснове – духоўнае ўвасабленне чалавека і народа, сукупнасць духоўных каштоўнасцей, працэс іх стварэння, засваення і ацэнкі як грамадствам, так і асобным чалавекам. У шырокім сэнсе, прастора культуры складаецца са створаных народам і перадаваемых з пакалення ў пакаленне каштоўнасцей, ідэй, сімвалаў, веравання, звычаяў, нормаў і правілаў паводзін, што вызначаюць жыццё людзей.

Культуру трэба адрозніваць ад цывілізацыі. Цывілізацыя таксама стварае каштоўнасці – матэрыяльныя і сацыяльныя, неабходныя для жыцця і існавання чалавека.

Дык у чым жа розніца? «Розніца якраз у духоўнасці, якая з'яўляецца стрыжнем культуры, яе асновай і крыніцай…

Вера, Ісціна (г. зн. веды, правераныя практыкай), Мараль (варта нагадаць «залатое правіла» паводзін: «Трэба ставіцца да іншага чалавека так, як табе хочацца, каб людзі ставіліся да цябе») і эстэтычная культура асобы (уключаючы тонкасці мастацкага перажывання) – гэта складае сутнасць духоўнасці ў нашы дні і з'яўляецца звышзадачай усяго працэсу адукацыі і выхавання моладзі» [5].

Ва ўмовах нашага часу набываюць новую трактоўку такія катэгорыі, як мараль і маральнасць, размяжоўваюцца паняцці «асоба» і «індывід».

Па вызначэнні прафесара БДУ А. Андрэева, мараль – гэта сістэма каштоўнасцей, якая прымае форму нормаў і правілаў і рэгулюе паводзіны індывіда з пункту гледжання інтарэсаў грамадства; мараль – гэта звод сацыяцэнтрычных догмаў і канонаў, якія забяспечваюць прыярытэт патрэбнасцей соцыуму над патрэбнасцямі асобы. Інтарэсы асобы ўключаюцца ў мараль роўна ў той ступені, у якой асоба запатрабавана грамадствам і цікавая яму (г. зн. у мінімальнай ступені).

Маральнасць – гэта сістэма каштоўнасцей, якая прымае форму нормаў і правілаў і рэгулюе паводзіны індывіда з пункту гледжання інтарэсаў асобы (у якія інтарэсы грамадства ўключаюцца як асноўная частка). Маральнасць – гэта дыялектычна гнуткі, аднак універсальны, нарматыўны кодэкс асобы, у аснове якога ляжыць персонацэнтрычная арыентацыя.

Мараль і маральнасць суадносяцца як індывід і асоба, як соцыяцэнтрум і персонацэнтрум, як псіхіка і свядомасць, як натура і культура.

Маральныя адносіны рэгламентуюцца інтэлектам – інструментам працягу несвядомага, калі адносіны чалавека ў грамадстве пачынаюць рэгулявацца розумам (свядомасцю), мараль саступае месца маральнасці, як больш нізкая сістэма рэгуляцыі – больш развітай, высокай. Маральнасць узнікае на аснове маралі, але не адмаўляе апошнюю [6]. Для стабільнага развіцця краіны неабходна выхоўваць асобу маральную, прыкладаючы шмат намаганняў праз усе магчымыя сродкі ўздзеяння на чалавека.

Вядома, што за тысячагоддзі свайго існавання чалавецтва перажыло тры інфармацыйныя рэвалюцыі: першая была звязана з вынаходствам пісьменнасці, дзякуючы чаму ўзніклі цывілізацыі; другая рэвалюцыя – вынаходніцтва кнігадрукавання – далучыла да вытанчанай пісьмовай культуры шырокія масы людзей. Прычым ядром кніжнай культуры выступалі свяшчэнныя тэксты Ведаў, Карана, Пяцікніжжа і Бібліі, што надавала кніжнай эпосе ў гісторыі чалавецтва вектар напружанага духоўнага пошуку. Трэцяя з рэвалюцый прывяла да ўзнікнення электронных сродкаў інфармацыі і камунікацыі, у тым ліку і Інтэрнэта, садзейнічала ўзнікненню новых неадназначных з'яў. Ужо ў саміх назвах асноўных сродкаў сучаснай камунікацыі – Сусветная сетка, Глабальнае павуцінне – хаваецца выклік і насцярожваюць сэнсы гэтых назваў. Новыя сродкі камунікацыі адпавядаюць постмадэрнісцкаму стану культуры і арыентаваны на бясконцы плюралізм, раўназначнасць дабра і зла, высокага і нізкага, прытворнага і сапраўднага, прыгожага і агіднага, што ставіць пад пагрозу такую функцыянальную характарыстыку чалавечага быцця, як духоўнасць.

Можна сказаць, што ў такіх выпадках ставіцца пытанне не толькі аб духоўнасці асобы, але і аб карыснасці яго для грамадства, аб яго фізічным здароўі і нават захаванні жыцця. Каб не страціць частку грамадства праз уплыў камп'ютарных тэхналогій, некаторыя дзяржавы ўводзяць у Інтэрнэт забарону на інфармацыю, якая скіравана на разбурэнне ў свядомасці чалавека ідэалу высокай духоўнасці; медыкі спрабуюць лячыць ад камп'ютарнай залежнасці.

Варта адзначыць, што сёння не кожны чалавек можа адрозніць дабро і зло, а ведаючы гэта адрозненне, можа свядома тварыць зло. Зараз зло пераапранаецца ў адзенне дабра і пачынае панаваць у свеце. Задача маральна-духоўнага выхавання – зрабіць сябе і свет навокал лепшым. Чалавек створаны для дабра, быць шчаслівым і атрымліваць асалоду ад вечнасці, таму важна для яго выбраць правільны шлях у жыцці. Не прапусціць галоўнае. На жаль, мы яшчэ не дастаткова адукаваныя ў духоўнай галіне. І не толькі ў вызначэнні дабра і зла. Скарб нашай нацыянальнай культуры неацэнны, але мы не ўсе ведаем яе і не цэнім. Неабходна памяняць ацэнку, што дасць імпульс умацавання патрыятызму. А патрыятызм – гонар за краіну, за сённяшні дзень, упэўненасць у будучым – гэта таксама духоўнае паняцце.

Крыніцы духоўнасці са старажытных часоў былі ў самой сутнасці чалавека як творцы культуры, стваральніка духоўных каштоўнасцей. З вынаходніцтвам Інтэрнэта, здавалася б, патэнцыял развіцця і распаўсюджвання духоўнасці мог бы павялічыцца, бо чалавек, выкарыстоўваючы інфармацыйныя інавацыі, перамяшчаецца з матэрыяльнага свету ў свет ідэальнай сутнасці, рознабакова рэалізуючы свае духоўныя здольнасці. Але паняцце духоўнасці асобы не супадае з паняццем духоўнай дзейнасці, якая ўключае ў сябе разумовыя, лагічныя аперацыі, рацыянальны разлік, якія могуць не адпавядаць паняццю духоўнасці і нават уступаць у супярэчнасць з ім.

Духоўнасць як характарыстыка асобы звязана з паняццем маральнасці і адказнасці, самаахвярнасці і сацыяльна-арыентаванай актыўнасці. Ці з'яўляюцца носьбітам духоўнасці сучасныя СМІ? Асноўныя інфармацыйныя плыні ў сучасным свеце групуюцца вакол мэтаў узбагачэння любой цаной. Таму нашу эпоху можна назваць эпохай сусветнага падману, а магчымасці маніпулявання свядомасцю мільёнаў людзей сталі беспрэцэдэнтнымі. Уласна Інтэрнэт выступае як найважнейшы фактар глабалізацыі, забяспечваючы фарміраванне адзінай, агульна-сусветнай інфармацыйнай эпохі [7].

**Заключэнне.** У XXI ст. стабільнае развіццё краіны немагчыма без кардынальнага рашэння пытанняў, скіраваных на фарміраванне творчай, мабільнай, гібкай, з багатым гуманістычным патэнцыялам асобы. Развіваючы інтэлект, неабходна выхоўваць ідэалы высокай духоўнасці.

## Літаратура

1. Николаевский, В. В. Фиаско мирового эгоизма / В. В. Николаевский // Беларуская думка. – 2009. – № 10. – С. 46.

2. Кастельс, М. Информационная эпоха: информационное общество и культура / М. Кастельс. – М.: ГУВШЭ, 2000.

3. Митрополит Минский и Слуцкий Филарет, Патриарший Экзарх всея Беларуси. Глобализация с богословской точки зрения / Филарет // Вступительное слово Митрополита Филарета на семинаре в Институте философии РАН в рамках Рождественских чтений 29 января 2004 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:/minds.by/trudy/special/trs_15.html. – Дата доступа: 10.08.2009.

4. Осипов, А. И. Путь разума в поисках истины / А. И. Осипов. – М.: Даниловский благовестник, 1997. – С. 196–205.

5. Салееў, В. А. Духоўнасць і культура / В. А. Салееў // Народная асвета. – 2001. – № 6. – С. 74.

6. Андреев, А. Н. Духовно экзистенциальный феномен / А. Н. Андреев // Беларуская думка. – 2009. – № 9. – С. 112–116.

7. Кирвель, Ч. С. Эпоха вселенского обмана: Информационный взрыв и судьбы духовности / Ч. С. Кирвель, И. В. Бусько // Беларуская думка. – 2009. – № 9. – С. 64–73.

*Паступіў 02.04.2010*